Весці БДПУ. Серыя 1. 2023. № 1. С. 96–99.

УДК 821.161.3:[82-31:141.72] М. Зарэцкі

# МАСТАЦКАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ ФЕМІНІСЦКІХ ІДЭЙ У АПАВЯДАННЯХ М. ЗАРЭЦКАГА

**Н. В. Заяц,**
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 13.01.23.

UDC 821.161.3:[82-31:141.72] М. Зарэцкі

# ARTISTIC REFLECTION OF FEMINIST IDEAS IN WORKS BY M. ZARETSKY

**N. Zayats,**
*PhD in Philology, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Belarusian and Foreign Literature, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 13.01.23.

Артыкул прысвечаны даследаванню апавяданняў М. Зарэцкага «Ганулям», «Бель», «Дзіўная» праз прызму феміністскіх ідэй.

*Ключавыя словы*: апавяданне; фемінізм; вобраз «новай жанчыны»; мараль; канфлікт.

The article is devoted to studying the works by M. Zaretsky "Ganylya", "Bel", "Dziunaya" through the prism of feminist ideas. On the material of the works from the 1920 the author considers the questions of feminist axiology (women's place in life, their attitude to love, marriage, children and etc.). The main attention is given to the image of a "new woman", the life philosophy of female characters is revealed. The article considers the changes in the writer's artistic reception of gender transformations in society: from eulogy ("Ganulya") to showing negative consequences for a woman and her surrounding, conflict of the "old" and the "new" morals, its destructive impact on the personality ("Bel", "Dziunaya"). The radical views of M. Zaretsky's female characters are compared to the past (A. Kalantay's concept) and present-time (child-free ideology) social trends.

*Keywords:* story; feminism; "new woman" image; moral; conflict.

Міхась Зарэцкі ў 1920-я гг. па праву лічыўся ці не самым папулярным празаікам. Актыўная літаратурна-грамадская дзейнасць (уваходзіў у склад Цэнтральнага бюро аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк», рэдагаваў аднайменны часопіс, быў адным з ініцыятараў стварэння новага згуртавання «Полымя») не перашкаджала яму плённа займацца творчасцю. Кнігі М. Зарэцкага, што выдаваліся з зайздроснай перыядычнасцю і частатой – па некалькі на год, прынеслі пісьменніку чытацкае прызнанне і адразу перавялі з пачаткоўцаў у разрад куміраў. «Мы тады зачытваліся М. Зарэцкім, – згадваў Я. Скрыган. – Пісаў ён многа, горача і ярка» [1, с. 33].

Апавяданні і буйныя празаічныя творы гэтага аўтара надзвычай смелыя і нетрадыцыйныя ў праблемна-тэматычным плане не толькі для тагачаснага, але і сённяшняга вопыту нацыянальнай літаратуры. Грамадскія тэндэнцыі, распаўсюджаныя ў 1920-я гг. і зафіксаваныя пісьменнікам, выяўляюцца на новым гістарычным вітку, таму праблемы і пошукі герояў паўстаюць як надзённыя. У мастацкіх тэкстах М. Зарэцкага, у прыватнасці, «малой» прозе, вялікая ўвага надаецца пытанням, што палягаюць у сферы фемініскай аксіялогіі: месца жанчыны ў жыцці, яе адносіны да кахання, шлюбу, дзяцей і інш. Фемінізм (імкненне жанчын да роўнасці з мужчынамі) за некалькі стагоддзяў з грамадскага руху суфражыстак, барацьбітак за выбарчае права, трансфармаваўся ў глабальную сацыяльную плынь, папулярную ідэалогію. І сёння ў розных краінах рэгулярна праходзяць разнастайныя акцыі, на якіх феміністкі агучваюць вострыя праблемы, выступаюць супраць шматлікіх праяўленняў гендарнай дыскрымінацыі.

Адным з першаадкрывальнікаў «жаночага свету» ў айчынным слоўным мастацтве справядліва лічыцца М. Зарэцкі. «Пісьменнік увёў жанчыну з яе інтымнымі, духоўнымі перажываннямі ў кантэкст вялікай літаратуры. Сілаю таленту мастак здолеў занатаваць для нашчадкаў працэсы грамадскай дэфармацыі вобраза традыцыйнай жанчыны ў савецкую, якая на дзесяцігоддзі зойме сваё месца ў нацыянальнай прозе» [2, с. 7]. У «малой» прозе М. Зарэцкага асэнсоўваюцца складаныя працэсы перараджэння жанчыны, паказваюцца пабочныя эфекты падобных метамарфоз.

Прыхільніцай фемінісцкіх каштоўнасцей у версіі ранняга сацыялізму з'яўляецца галоўная гераіня апавядання **«Ганулям»** (1924). У цэнтры пісьменніцкай увагі знаходзіцца праблема эмансіпацыі жанчыны-сялянкі. Але гэта не проста жанчына, падпарадкаваная мужу, знясіленая бясконцай працай, а маці-адзіночка. У традыцыйнай вясковай культуры нараджэнне дзіцяці без шлюбу лічылася плямай на біяграфіі, прычым і для «грэшніцы», і для немаўляці. Ганулі, пакрыўджанай каханым (падмануў), братам (выгнаў з бацькоўскай хаты), аднавяскоўцамі (жартам, але не прамінуць нагадаць пра яе «грэх»), даецца шанц пераадолець

адчуванне ўласнай непаўнавартаснасці, пазбавіцца стыгматызацыі. Такое стала магчымым пасля прыезду ў вёску актывісткі, якая здзіўляе сялян нават сваім выглядам і манерай паводзін: *«І вось тады прыехала тая, з горада. Худая, вочы гараць ліхаманкавым бляскам. Гаварыла грубаватым, глыбокім голасам»* [3, с. 159]. *«Гарадская яслі адчыніць захацела. Дзіўная… Чаго ёй прыспела? Што ёй за наўда: ну, жывуць бабы і жывуць, як спрадвеку жылі»* [3, с. 160]. Кансерватыўная вёска не спяшаецца прымаць новаўвядзенні (*«Нялюба бабам, што жыццё іх кратаюць, ды варушаць, ды пераглядаюць з усіх бакоў. Прывыклі ў запечны...»* [3, с. 160]), але Ганулі няма чаго страчваць, і яна з задавальненнем выконвае новыя для сябе ролі. Спачатку становіцца выхавацелькай у імправізаваным дзіцячым садку, наладжвае дапамогу жачынам у мыцці адзення. Заўчасна пастарэлая гераіня маладзее, нібы перараджаецца ў іншага чалавека: былая пакрыўджаная сялянка іграе ў самадзейных тэатральных пастаноўках і ўрэшце атрымлівае запрашэнне ў *«павятовы аддзел па працы сярод кабет»*. У пачатку 1920-х гг. у маладой савецкай дзяржаве ўтварылася разгалінаваная сетка такіх аддзелаў («жанаддзелаў»), што праводзілі гендарныя рэформы, спрыялі жаночай эмансіпацыі. (Рэцэпцыі гэтых працэсаў айчыннай літаратурай прысвечаны грунтоўны артыкул Т. Фіцнер [4].)

Інтэнцыя пісьменніка адназначная: у рэчышчы тагачаснай дзяржаўнай палітыкі і ва ўзнёслапафасным стылі «Маладняка» М. Зарэцкі выказвае веру ў магчымасць сацыяльных пераўтварэнняў, змяненне гендарных роляў. Пісьменнік вітае новае жыццё Ганулі, якая спраўдзіла, здавалася б, нязбытную мару «людзьмі звацца», адчуваць сябе асобай, здольнай мяняцца самой і мяняць свет.

У розныя эпохі фемінізм меў сваіх апалагетаў, у ліку якіх расійская рэвалюцыянерка і савецкая дзяржаўная дзяячка А. Калантай. Яшчэ ў 1913 г. у працы «Новая жанчына» яна прапанавала канцэпцыю, што была ўзята на ўзбраенне будаўнікамі савецкага ладу, у тым ліку і на Беларусі. Сярод характарыстык «новай жанчыны» вылучаліся наступныя: «самадысцыпліна замест эмацыянальнасці, уменне даражыць сваёй свабодай і незалежнасцю замест пакоры і безасабовасці; сцвярджэнне сваёй індывідуальнасці замест наіўнага старання ўвабраць і адлюстраваць чужое аблічча “любімага”, прад’яўленне сваіх правоў на “зямныя” радасці замест крывадушнага нашэння маскі нявіннасці, нарэшце, адвядзенне любоўным перажываванням падначаленага месца ў жыцці» [5] [пераклад наш. – *Н. З.*]. «Новая жанчына» разглядалася перш за ўсё як Чалавек, а не «самка і цень мужчыны» [5].

Прыведзеным уяўленням пра «Чалавека-жанчыну» адпавядае галоўная гераіня апавядання **«Бель»** (1924). Камуністка-актывістка Ганна Матузова з задавальненнем наведвае партыйныя сходкі, дзе выступае з палымянымі прамовамі. Бескампрамісная і незалежная, яна выкрывае кансерватызм мужчын (*«Трусы вы, во што! Здалелі зрабіць рэвалюцыю, свет перавярнуць, усё дыбарам паставіць, а жыццё сваё змяніць баіцёся. Жонак спалохаліся»* [3, с. 176]), а таксама пасіўнасць і несвядомасць жанчын, што даюць сябе ў крыўду (*«Дурныя яшчэ бабы. Затым і здзекуецца ваш брат над імі»* [3, с. 171]).

Такой неардынарнай, не падобнай на іншых дзяўчынай захапіўся завадскі рабочы Даніла Чаборскі. Ён гатовы развесціся са знелюбелай жонкай, пакінуць дзяцей, каб звязаць жыццё з Ганнай. Аднак сацыяльны інстытут сям’і гераіня ўспрымае як тое, што абмяжоўвае свабоду. *«Даніла! Дык гэта ж неразумна... Якая ж карысць, якая выгада? Ты адны путы хацеў змяніць на другія? Ты хацеў вырвацца з багны сям’і, каб у другую трапіць?»* [3, с. 205], – тлумачыць яна хваравіта закаханаму прыхільніку традыцыйных каштоўнасцей памылковасць і несучаснасць яго поглядаў. Ганна даволі лёгка ставіцца да інтымных адносін: не згадвае пакінутага мужа, хутка сыходзіцца з Данілам, пасля пераключае ўвагу на сакратара ячэйкі Змітровіча. Пэўны час «зямныя» радасці для «новай жанчыны» не з’яўляюцца прыярытэтнымі, але нечакана для сябе, нягледзячы на дэклараванае жаданне быць незалежнай, яна падпадае пад уладу эмоцый – адчувае каханне да Змітровіча. Ганна баіцца свайго пачуцця, але не супраціўляецца яму: *«Я сама люблю волю... Я знаю, што дрэнна так будзе... <…> Ну, няхай сабе й так... Я люблю яго... моцна люблю, бо ён прыгожы, разумны, ён... падабаецца мне...»* [3, с. 205].

Маладая і ўпэўненая ў сабе Матузова пакуль не сутыкнулася з жыццёвымі рэаліямі, калі ўзятая за арыенцір сістэма поглядаў аказваецца не такой дасканалай і ўніверсальнай, як уяўлялася. Смерць Данілы наўрад ці прымусіць Ганну правесці рэвізію сваіх перакананняў, а вось каханне да сакратара ячэйкі ў гэтым сэнсе адкрывае для яе перпектывы. Даследчыца І. Воюш, аднак, зрабіла песімістычны прагноз будучыні гераіні: «Вобраз Ганны Матузовай, як большасць жаночых вобразаў у прозе Міхася Зарэцкага, трагічны. Жанчына стаіць на шляху да адзіноты, бо не мае душэўнай прывязанасці, яе барацьба за вольны свет перарасла ў барацьбу з сабой» [6, с. 11].

Паглыбленне ў псіхалогію «новай жанчыны» дазволіла М. Зарэцкаму стварыць сітуацыю, калі бяздумнае следаванне ўстаноўкам «сацыялістычнага фемінізму» прывяло да непрадбачаных і балючых вынікаў, пачало разбураць асобу. У апавяданні **«Дзіўная»** (1925) канфлікт «новай» і «старой» маралі, «барацьба з сабой» паказаны праз вобраз Шумавай, камандзіраванай *«на працу сярод жанчын»*. Гэтая «новая жанчына» таксама апантаная грамадска-агітацыйнай дзейнасцю. Уласцівая ёй прыродная эмацыянальнасць цалкам выцясняецца самадысцыплінай, рашучасцю, катэгарычнасцю, калі яна толькі гаворыць аб справе: *«Блонскі глядзеў на яе і дзівіўся яе сціслай сур’ёзнасці. Зусім не так, як учора. Ніводнага староннягa слова, быццам, апрача справы, нічога няма ва ўсім свеце.*

*Нават аганькі ў вачах – сталёвыя нейкія, цвёрдыя»* [3, с. 241]. Шумава паказваецца асобай больш складанай і неадназначнай, чым Ганна Матузова, а яе гісторыя можа ўспрымацца як працяг жыццёвых перыпетый гераіні апавядання «Бель».

Харызматычная, смелая, дапытлівая, «дзіўная», яна вабіць мужчын, у прыватнасці, старшыню выканкама Блонскага. Ён заўважае рэзкія перапады настрою, што выдаюць пастаянныя ўнутраныя хістанні, сведчаць пра надлом, душэўную раздвоенасць і неўладкаванасць, асабліва адчувальныя ў размовах пра «жаночае пытанне»: *«Здавалася, што пад гэтым сухім, троху мітынговым тонам ёсць нешта схаванае, палахліва затоенае. Адчуваўся нейкі ледзь прыкметны фальш у гэтых цвёрдых, энергічных словах аб вызваленні жанчыны, аб змаганні з іржавымі путамі сям'і, аб рэвалюцыі быту і г. д. А часам Блонскі выяўна чуў у яе голасе мімалётныя ноткі няпэўнасці, нейкага сумнага неўразумення»* [3, с. 241].

Аўтар не дае героям імёнаў – адны прозвішчы, у чым бачыцца не толькі тагачасная практыка, своеасаблівая мода ў афіцыйных колах, але і нівеліроўка асобаснага пачатку. Такім чынам узбуйняецца сацыяльны складнік героя і мінімізуецца асабіста-інтымны – Шумава і Блонскі паўстаюць не людзьмі, асобамі, а функцыянерамі («*шрубчыкамі»*, як называла «новых людзей» Ганна Матузова, параўноўваючы грамадства з механізмам).

На жаночым з'ездзе Шумава добрасумленна выконвае сваю функцыю: горача тлумачыць дэлегаткам перавагі новага ладу, неабходнасць і магчымасць са змораных работніц ператварыцца ў паўнавартасных удзельнікаў грамадскага будаўніцтва. Сама максімалістка, яна хоча, каб і сялянкі, прадстаўніцы «старой», традыцыйнай маралі, прынялі дзікунскае для жанчыны-маці наватарства. *«Прапанавала: адбіраць ад матак іхніх дзяцей і дамы выхавання наладжваць. Каб матка не знала сына свайго, а сын маткі, каб агульныя, усіхныя дзеці былі. Проці гэтага жанчыны-маткі агнём загарэліся. Казалі: жорстка гэта і крыўдна»* [3, с. 243].

Радыкальная ідэя добраахвотнага адмаўлення ад дзяцей, якая, на шчасце, не прыжылася, у нечым сугучная сучаснай канцэпцыі чайлдфры (свядомае нежаданне мець дзяцей). Сярод яе матываў паслядоўнікі называюць магчымасць спантанна змяняць працу і месца жыхарства; усведамленне таго, што нараджэнне дзіцяці пашкодзіць кар'ернаму росту; непажаданасць страт часу, сіл, прыватнасці і свабоды і інш. [7]. Калі чайлдфры адкрыта тлумачаць абраную пазіцыю асабістымі прычынамі, уласным выбарам, то рэфарматары сямейнага пытання ў 1920-х гг. прыкрываліся лозунгамі аб грамадскім дабрабыце, імкненні разняволіць жанчыну, клопатам пра ўжо народжаных дзяцей. Шумава праводзіць у жыццё наватарскія погляды аб тым, што выхаванне ў сям'і абернецца злом для дзіцяці: *«Гэта злачынства... так, злачынства. Гэта псаванне дзяцей... І сабе нахаба...»* [3, с. 243]; *«Мы псуем іх. Мы з дзяцінства навальваем на іх лішнія прыхільнасці, прывычкі, якія шкодны, якія шмат для каго путамі будуць. Гэта ж несправядліва. За гэта яны клясці нас будуць»* [3, с. 243]. Усе яе палымяныя тырады бяздоказныя, пакольki заснаваны на сляпой веры. Здаецца, Шумава хоча пераканаць не столькі іншых, колькі саму сябе: *«Слухайце, гэта ж ясна, як дзень. Нам трэба тварыць новых людзей, людзей калектыву, у якіх няма матак, бацькоў, у якіх бацькі – усё чалавецтва. Да гэтага трэба ісці. І гэта магчыма... у невялічкай мерцы, але і цяпер ужо магчыма... Ці ж няпраўда?..»* [3, с. 243]. Пісьменнік з псіхалагічнай дакладнасцю паказвае, што фіксацыя ўвагі, асаблівая ўстурбаванасць пэўнай праблемай могуць сведчыць пра нейкую траўму чалавека, асабістую драму. Драма «дзіўнай» раскрыецца ў фінале твора.

Шумава літаральна ўспрыняла ідэю «новай жанчыны»: вырашае пазбавіцца ад ўсяго таго, што можа рабіць яе падобнай на «жанчыну-рабу». Дзеля гэтага яна не проста адводзіць любоўным перажыванням, інтымным стасункам падначаленае месца, а ўвогуле мае намер выкараніць іх. Адчуўшы каханне да Блонскага, яна вырашае прыпыніць адносіны, нават змяніць месца жыхарства. *«Гэта трэба. Я растлумачу табе... Я моцна, глыбока к табе прывязалася... Ты ведаеш гэта. Больш, чымся трэба... І вось – я баюся... Сама сябе баюся... Ува мне можа абудзіцца жанчына... Не наогул жанчына, а такая... ну, слабая, адданая, бязвольная... Жанчына-раба, такая, якой не павінна быць, якая – знявага для чалавека... Я спалохалася гэтага і пастанавіла паехаць»* [3, с. 246]. Яе ўчынкі падпарадкаваны ўласнай логіцы, цалкам адпаведнай тэорыі «новай жанчыны», якая (тэорыя) уяўляе сабой утрыравана-вычварную інтэрпрэтацыю ідэй фемінізму. Паводле Шумавай і згодна з фармулёўкамі А. Калантай, слова «жанчына» ў класічным разуменні выступае антонімам паняцця «чалавек», і гераіня апавядання выбірае быць чалавекам: *«Я не хачу быць жанчынай, толькі жанчынай. Я хачу быць чалавекам»* [3, с. 249].

Падчас развітальнай размовы Шумава намякае на нейкую тайну, якая вымушае яе бегчы – не толькі ад Блонскага, але і ад сябе (*«Я хацела б і сама не знаць гэтага, бо гэта маё слабае месца, ахілесава пята…»* [3, с. 246]). Урэшце загадка «дзіўнай» раскрываецца – кульмінацыяй твора з'яўляецца сцэна каля дзіцячага дома, калі свабодная жанчына, пазбаўленая ўсялякіх «лішніх» прывязанасцей, кідаецца да аднаго з хлопчыкаў, забыўшыся на свае ідэі: *«А з Шумавай тварылася нешта незразумелае. Яна паспешна прыбавіла ходу, быццам хацела хутчэй уцячы ад дзяцей. Потым раптам спынілася, вярнулася назад і парыўчата схапіла аднаго з хлопчыкаў – беленькага, з блакітнымі вочкамі-зорачкамі. Дзіцёнак трапятаўся, нецярпліва адмахваўся, як ад дакучнае мухі, з усіх сіл вырываўся. Злаваў, што яго адарвалі ад цікавай гульні. А яна горача песціла яго, цалавала»* [3, с. 248–249]. Такія *«мінуты слабасці»* сведчаць пра тое, што Шумавай не ўдалося перамагчы сваю

натуру, як бы яна ні старалася. Адкрыты фінал твора наводзіць на роздум і нараджае шмат пытанняў, абмеркаванне якіх дазволіць чытачам «прымерыць на сябе» змадэляваныя пісьменнікам жыццёвыя сітуацыі, разгледзець іх з пазіцый сучаснасці, з улікам сённяшніх рэалій.

Апавяданні М. Зарэцкага «Ганулля», «Бель», «Дзіўная», такім чынам, дазваляюць прасачыць, як моцна праз занадта спрошчанае разуменне і катэгарычную інтэрпрэтацыю могуць дэфармавацца любыя ідэі, у дадзеным выпадку феміністкія. У выніку цалкам апраўданыя і неабходныя гендарныя рэформы замест чаканага вызвалення жанчыны ўключылі яе ў новую барацьбу – з уласнай прыродай, з самой сабой.

*Літаратура*


1. *Скрыган, Я.* Некалькі хвілін чужога жыцця : апавяданні, успаміны, роздум / Я. Скрыган. – 2-е выд., дап. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 358 с.
2. *Воюш, І. Д.* Трансфармацыя вобраза жанчыны ў беларускай прозе ХХ стагоддзя : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.01.01 / І. Д. Воюш ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2004. – 21 с.
3. *Зарэцкі, М.* Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1989–1992. – Т. 1 : Апавяданні ; прадм. М. Мушынскага. – 1989. – 526 с.
4. *Фіцнер, Т.* Жаночая эмансіпацыя праз прызму беларускай літаратуры 20-х гадоў ХХ стагоддзя / Т. Фіцнер // Полымя. – 2018. – № 6. – С. 105–113.
5. *Колонтай, А.* Новая женщина [Электронный ресурс] / А. Колонтай. – Режим доступа: http://www.odinblago.ru/novaia_moral/1. – Дата доступа: 12.12.2022.
6. *Воюш, І.* У непрытульным свеце…: жаночыя вобразы ў прозе Міхася Зарэцкага [пачатак] / І. Воюш // Род. слова. – 2004. – № 9. – С. 9–12.
7. Чайлдфры [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя : свабодная энцыклапедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%A7%D0%B0%D0%B9%D0%BB%D0%B4%D1%84%D1%80%D1%8B. – Дата доступу: 12.12.2022.


*References*


1. *Skryhan, J.* Nekalki hvilin chuzhoha zhyccia : apavyadanni, uspaminy, rozdum / J. Skryhan. – 2-e vyd., dap. – Minsk : Mast. lit., 1990. – 358 s.
2. *Voyush, I. D.* Transfarmacyja vobraza zhanchyny u belaruskay proze XX stahoddzya : autaref. dys. ... kand. filal. navuk : 10.01.01 / I. D. Voyush ; Belarus. dzyarzh. un-t. – Minsk, 2004. – 21 s.
3. *Zaretski, M.* Zbor tvorau : u 4 t. / M. Zaretski. – Minsk : Mast. lit., 1989–1992. – T. 1 : Apavyadanni ; pradm. M. Mushynskaha. – 1989. – 526 s.
4. *Fitsner, T.* Zhanochaya emansipacyya praz pryzmu belaruskay litaratury 20-ch XX stahoddzya / T. Fitsner // Polymya. – 2018. – № 6. – S. 105–113.
5. *Kolontay, A.* Novaja zhenshchina [Elektronnyy riesurs] / A. Kolontay. – Rieshim dostupa: http://www.odinblago.ru/novaia_moral/1. – Data dostupa: 12.12.2022.
6. *Voyush, I.* U neprytulnym svece…: zhanochyja vobrazy u proze Michasya Zaretskaha / I. Voyush // Rod. slova. – 2004. – № 9. – S. 9–12.
7. Chayldfry [Elektronny resurs] // Wikipedia : svabodnaja encyklapedyja. – Rezhym dostupu: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%A7%D0%B0%D0%B9%D0%BB%D0%B4%D1%84%D1%80%D1%8B. – Data dostupu: 12.12.2022.